УДК 745.542(476)

**М. М. Лопух, Л. Р. Капуза**
*Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Баранавічы*

# ВЫЦІНАНКА: АД ТЭМЫ ДА ТВОРЧАГА ВЫКАНАННЯ

**Уводзіны.** Сучасныя студэнты, за рэдкім выключэннем, пры выкананні выцінанак асноўную ўвагу звяртаюць на засваенне тэхнікі выканання, а затым — на змест. Нярэдка аўтары артыкула назіралі сітуацыю, калі студэнты, атрымаўшы заданне, у пошуку мастацкага рашэння працы ў першую чаргу арыентаваліся на гатовыя малюнкі або схемы.

У арганізацыі творчага падыходу да выканання работы выкарыстоўваюцца розныя метады і прыёмы. Адным з такіх прыёмаў, на наш погляд, з'яўляецца абавязковае выкананне работы на прапанаваную тэму, адлюстроўваючы якую, студэнты засвойваюць тэхніку яе выканання.

Несумненная актуальнасць і недастатковая прапрацаванасць выдзеленай праблемы вызначылі мэту нашага даследавання: абагульненне вопыту развіцця творчых здольнасцей студэнтаў у працэсе выканання выцінанкі.

**Асноўная частка.** Выцінанка (выстрыганка, выразка) — ажурны ўзор або кампазіцыя, выразаная з паперы, — від народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Прынцып стварэння выцінанкі — наразанне краёў шматразова складзенага аркуша паперы, у выніку чаго выразаны матыў дакладна паўтараецца адпаведна колькасці складвання [1, с. 423].

Беларуская выцінанка стала самастойным відам дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва толькі ў пачатку XIX стагоддзя. У розны час яна перажывала свой росквіт і затым зноў станавілася абсалютна забытым відам дэкору. Толькі ў канцы 80-х гадоў мінулага стагоддзя, дзякуючы вядомаму беларускаму вучонаму і даследніку Я. М. Сахуце, з'яўляюцца публікацыі, у якіх аўтар звяртае ўвагу на выцінанку як на самастойны від дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Спрыяюць папулярызацыі выцінанкі выдадзеныя ў нашай рэспубліцы ў розныя гады вучэбныя дапаможнікі В. А. Дубінкі, М. П. Жабінскай, У. І. Каваленкі і іншых аўтараў. У іх асветлены гісторыя, нацыянальныя асаблівасці беларускай выцінанкі, сучасны стан і метадычныя аспекты яе выканання.

У традыцыйных выцінанках найбольш часта сустракаюцца геаметрычныя і раслінныя матывы.

Геаметрычныя матывы цесна звязаны з узорамі іншых відаў традыцыйных народных рамёстваў. Але ў канцы XIX — пачатку XX стагоддзя з'яўляецца цікавасць да рэалістычных матываў і сюжэтаў. Геаметрычныя знакі з іх сакральным сэнсам сталі забывацца, таму раслінныя матывы набываюць вялікую папулярнасць. Моцны ўплыў аказвае таксама гарадская культура сваімі кнігамі, альбомамі па рукадзеллі, модай на квяцістыя тканіны фабрычнага вырабу. Кветкавы матыў — любімы ў папяровых карунках. З тканых і вышытых вырабаў у выцінанку пераходзіць матыў вянка і вазона. Матыў вазона найбольш часта сустракаецца ва ўкраінскім народным мастацтве, асабліва ў роспісе. Ярка выяўленая дэкаратыўнасць прыцягнула і беларускіх майстроў. Ад традыцыйнай выцінанкі па-ранейшаму самым папулярным застаецца кампазіцыя з «Дрэвам жыцця». З жывёльнага свету адзін з найбольш распаўсюджаных матываў у выцінанцы вобраз птушкі цесна звязаны з паганскай міфалогіяй. Іншыя жывёлы малююцца даволі рэдка.

У выцінанцы прысутнічаюць і архітэктурныя матывы сіметрычнага характару. Амаль заўсёды архітэктурныя ўзоры дзівяць багаццем распрацаваных арнаментальных матываў і характэрнымі для выцінанак рознымі рытмічнымі паўторамі.

У сучасных беларускіх выцінанках прысутнічаюць і антрапаморфныя матывы. Цэнтральнай асновай сюжэту такіх работ з'яўляецца чалавек, часцей жаночы вобраз. Кампазіцыя можа складацца з двух, трох і больш дэкаратыўна распрацаваных фігур, якія трымаюць у руках птушак, кветкі, або штонебудзь іншае. Адзіночныя мужчынскія вобразы сустракаюцца рэдка. Падпарадкоўваючыся законам дэкаратыўнага мастацтва, фігура чалавека заўсёды малюецца франтальна або ў профіль.

Тэма чалавека прысутнічае ў працах, прысвечаных традыцыйным абрадавым святам і беларускай міфалогіі. Звяртае на сябе ўвагу дакладная перадача традыцыйных народных касцюмаў. Кананічныя хрысціянскія сюжэты ў выцінанцы перадаюць стылістыку іконы.

Партрэтная выява чалавека — рэдкі матыў у працах мастакоў, якія працуюць у тэхніцы выцінанкі. Па-першае, ён абсалютна не традыцыйны, па-другое, досыць складаны ў выкананні. Стылізаваныя партрэты з серыі «Поры года» адзначаны ў творчасці Н. Гамаюнавай.

Аналіз розных матываў выцінанак нашых дзён паказвае, што старажытная семантыка, геаметрычныя знакі і рэалістычныя сюжэты нараджаюць новыя вобразы і кампазіцыі, напоўненыя сучасным сэнсам.

Канец XX і пачатак XXI стагоддзя прынеслі выцінанцы вялікую папулярнасць як сярод прафесійных мастакоў, так і аматараў. Пісьменнік і фотакарэспандэнт В. Дубінка першым выкарыстаў выразаныя з паперы ўзоры для афармлення дзіцячых кніг. Так, Н. Сокалава-Кубай выпускае віншавальныя паштоўкі, ілюструе выцінанкамі календары, афармляе кнігі, плакаты [2, с. 261].

Сучасная выцінанка набыла станковыя рысы. Аформленыя ў рамку пад шкло кампазіцыі знаходзяць прымяненне ва ўпрыгожванні інтэр'ераў жылля або грамадскага памяшкання і з'яўляюцца самастойнымі творамі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

© Лопух М. М., Капуза Л. Р., 2018



Рэпазіторый БарДУ

Элементы выцінанкі таксама выкарыстоўваюцца ў стварэнні афармлення розных святаў і фестываляў. Гэты арыгінальны прыём быў ужыты ў Віцебску для афармлення сцэны амфітэатра на Міжнародным фестывалі мастацтваў «Славянскі базар-2002». Стала традыцыйным упрыгожваць выцінанкай вокны жылых дамоў, школ і іншых грамадскіх устаноў да святаў.

Як аказалася, традыцыйныя мастацкія рамёствы — зусім не «архаіка» або музейны набытак, а вельмі сучасная з’ява, якая пры ўмелым, беражлівым, клапатлівым падыходзе арганічна і натуральна ўключаецца ў наш сучасны побыт [3, с. 56].

Выкананне выцінанкі дае велізарны прастор для творчасці. Гэтаму спрыяе вялікая колькасць выдадзеных у апошні час дапаможнікаў з гатовымі малюнкамі, схемамі, а таксама інтэрнэт-сайты з майстар-класамі. Аднак на практыцы мы бачым тое, што гэтыя ўзоры работ студэнты бяздумна капіруюць, што пазбаўляе іх дзейнасць творчасці. Гэта выклікана тым, што не ўсе студэнты могуць самастойна вызначыць тэму будучай працы, некаторыя з іх маюць недастатковыя навыкі малявання.

У сваёй працы па дысцыпліне «Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва» перад выкананнем творчага задання мы арыентуем студэнтаў перш за ўсё на актуальную, сучасную тэматыку, прапаноўваем тэму, якая павінна быць рэалізавана ў адной з мастацкіх тэхнік. Напрыклад, намі было прапанавана выкананне аўтапартрэта ў тэхніцы выцінанкі. Педагогам вядома рэакцыя сучаснага студэнта на гэта: амаль усе студэнты пачынаюць шукаць у смартфонах падобныя работы. Але ў аналагах могуць быць знойдзены толькі тэхналогія выканання, асаблівасці малюнка партрэта, частак твару. А далей трэба шукаць сябе: які менавіта «я», шукаць свой вобраз. І тут Інтэрнэт бездапаможны. Не адразу, але ў ходзе ўласнага аналізу адзін уяўляе сябе ў выглядзе восені, другі — феі, трэці — рыцара і г. д. Затым ідзе эскізіраванне.

Пры выкананні эскіза выцінанкі студэнты знайшлі вобразнае рашэнне работы, але некаторыя сутыкнуліся з цяжкасцю — намаляваць падобны партрэт. Намі было прапанавана пераўтварыць свой фотапартрэт у стылізаваны малюнак у графічным рэдактары Paint.NET (Меню → Эфекты → Стылізацыя → Эскіз). Далей малюнак, выведзены на паперу, дапрацавалі традыцыйнымі мастацкімі матэрыяламі. Па эскізе работу выканалі ў матэрыяле.

Пасля выканання выцінанкі студэнты выказвалі свае адносіны да працы: «Цяжка было пачынаць, бо ў школе ўсе працы капіравала»; «Я атрымала шмат станоўчых эмоцый і з вялікім задавальненнем буду займацца выцінанкай»; «Я задаволена сваёй працай»; «Буду мець на ўвазе, што сама магу нешта прыдумаць». Як бачым, самастойная праца над эскізам эмацыйна «афарбавала» працэс пошуку і дазволіла раскрыць мастацка-творчыя магчымасці студэнтаў. У выніку працы студэнтамі было створана 54 работы. Зараз яны ўпрыгожваюць інтэр’ер універсітэта (рысунак 1).




Рысунак 1 — Фрагмент выставы выцінанкі «Аўтапартрэт»

У наступныя гады студэнты выконвалі выцінанкі на тэмы, прысвечаныя творчасці М. Багдановіча, жыццю і асветніцкай дзейнасці Ф. Скарыны, Году малой радзімы. Лепшыя работы экспанаваліся на рэспубліканскіх выставах сучаснай візуальнай творчасці студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў «АРТ-АКАДЭМІЯ», «ГРАНІ ТВОРЧАСЦІ» (Мінск, 2008—2017) і былі адзначаны дыпломамі пераможцы (8 дыпломаў Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь).

**Заключэнне.** Як традыцыйнае мастацкае рамяство выцінанка добра праілюстравана ў літаратуры. Калі педагог ставіць мэтай толькі засваенне тэхналагіі выканання работы і не вызначае яе тэмы, гэта спрыяе капіраванню работ. Для актывізацыі творчай дзейнасці студэнтаў у працэсе выканання выцінанкі важна прапанаваць цікавую і актуальную тэму перад пачаткам працы.

Творчая работа — гэта, безумоўна, цяжкасці, перашкоды, часам падзенні, няўдачы, аднак яны спрыяюць пошуку, развіццю, пераменам да лепшага і напаўняюць жыццё чалавека асаблівым сэнсам, дазваляюць яму радавацца жыццю, не чапляючыся за яго трывіяльныя каштоўнасці.

**Спіс цытаваных крыніц**

1. Культура Беларусі : энцыклапедыя : у 6 т. / рэдкал.: Т. У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. — Мінск : Беларус. энцыкл. імя П. Броўкі, 2010—2015. — Т. 2.
2. *Сахута, Я. М.* Беларускае народнае мастацтва / Я. М. Сахута. — Мінск : Беларусь, 2011. — 367 с. : іл.
3. *Сахута, Я. М.* Выцінанка — мастацтва сур’ёзнае / Я. М. Сахута // Маст. адукацыя і культура. — 2004. — № 2. — С. 56—58.

Репозиторий БарГУ